✓У доўгачаканы летні час мы любім падарожнічаць. А Свіслацкая дзіцячая бібліятэка дапамагае сваім чытачам правесці вольны час займальна і з карысцю. У чытальнай зале ўлетку сустракае маляўнічая кніжная выстава пад назвай **«Кніжны круіз без віз»**. Дзякуючы ёй з'яўляецца магчымасць здзейсніць цікавае падарожжа па розных краінах свету, спасцігнуць іх гісторыю, традыцыі і культуру, асаблівасці прыроды. Наведнікаў чакаюць таксама тэматычныя раздзелы «Лес цудаў», «Пачытаем казку з Васільком», «Мы чытаем і гуляем». У першым можна пазнаёміцца з казкамі на экалагічную тэму, даведацца аб жывёльным і раслінным свеце планеты Зямля. Пачытаць беларускія народныя казкі і творы айчынных пісьменнікаў дапамагае другі раздзел; трэці засяроджвае ўвагу на маляўнічых кнігах з гукавым суправаджэннем і на настольных гульнях.

✓НЦСМ 20 чэрвеня запрасіў аматараў мастацтва разам сустрэць лета і далучыцца да аднаго з старэйшых святаў нашых продкаў – дню летняга сонцастаяння. У рамках праекта «Вечера в НЦСИ» адбылася імпрэза **«Сонцаварот»**. Арганізатары прапанавалі паглядзець на традыцыйныя элементы праз прызму сучаснага мастацтва і гарадскога ладу жыцця.

Пад час імпрэзы адбыліся майстар-клас па маляванні агню ад мастака Руслана Сяргеева, прагулянка па свежай траве проста ў будынку музея, а кульмінацыяй вечарыны стала выкананне ўдзельнікамі Студэнцкага этнаграфічнага таварыства традыцыйных вакальных спеваў, сабраных актывістамі ў розных кутках краіны. А ў дадатак – чарадзейныя летнія водары ад кампаніі «АромаСтиль.бай» – водар лугавых траваў ды свежага пракоса.

✓23 чэрвеня ў галерэі «Ракурс» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі прайшло адкрыццё выставы графікі **«Полымя ваенных дзён»**, прысвечанай 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і прымеркаванай да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Прадстаўленыя творы з мастацкага фонду ГА «Беларускі саюз мастакоў», аўтары якіх – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны.

Распачынаюць экспазіцыю графічныя працы народнага мастака Беларусі Арлена Кашкурэвіча, дапаўняюць яе замалёўкі відавочцаў ваенных падзеяў Яўгена Зайцава, ІванаЦіханава, Сяргея Каткова, Віктара Сахненкі, Віктара Ждана, Мікалая Абрыньбы, Розы Дубар, Сяргея Раманава і Міхаіла Сеўрука. «Ні адна з гэтых ваенных замалёвак ніколі раней не экспанавалася. Упершыню прадстаўленыя ўвазе гледача невядомыя працы прызнаных беларускіх аўтараў», – зазначыў старшыня БСМ Глеб Отчык.

✓Арганізаваны Польскім Інстытутам у Мінску пры падтрымцы выдавецтва «Логвінаў» цыкл **«Санаторый пад клепсідрай»** правёў восьмую сустрэчу, што была прысвечаная знакамітаму польскаму літаратару беларускага паходжання Сяргею Пясецкаму, якому выпаў неймаверна пакручасты чалавечы і пісьменніцкі лёс. Сярод іншых тэмаў яго творчасці – як жылі кантрабандысты ў час, калі Мінск і Ракаў належалі розным краінам, як Ракаў зрабіўся месцам, дзе працавалі сто рэстаранаў і кавярняў з аркестрам. Арганізатары таксама разважалі, як астраномія дапамагае ў крымінальным бізнесе і ў каханні, чаму «мінская» трылогія называецца «зладзейскай» і што трэба ведаць пра Мінск – крымінальную сталіцу рэгіёну. Як перайсці мяжу між бульварным чытвом і высокім пісьменствам, абмінуўшы ўсе літаратурныя пасткі? – адказ на гэтае пытанне ўдзельнікі шукалі разам.

*Скарыстаная інфармацыя з сайтаў газет «Гарадоцкі веснік», «Свіслацкая газета», паведамленняў Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Польскага Інстытута ў Мінску*